**УСТАНОВА АДУКАЦЫІ**
**«БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ЭКАНАМІЧНЫ ЎНІВЕРСІТЭТ»**

**ЗАЦВЯРДЖАЮ**
Рэктар установы адукацыі
«Беларускі дзяржаўны
эканамічны ўніверсітэт»

__________________У.М. Шымаў
«_____»________________ 2018 г.
Рэгістрацыйны № УД
___________/ вуч.

# ТРЭЦЯЯ ЗАМЕЖНАЯ МОВА

## (БЕЛАРУСКАЯ)

Вучэбная праграма ўстановы вышэйшай адукацыі
па навучальнай дысцыпліне для спецыяльнасці 1-23 01 02
“Лінгвістычнае забеспячэнне міжкультурных камунікацый” (па напрамках)

2018

**УКЛАДАЛЬНІК:**
*Н.П. Старавойтава,* дацэнт кафедры беларускай і рускай моў установы адукацыі “Беларускі дзяржаўны эканамічны ўніверсітэт”, кандыдат філалагічных навук, дацэнт.

**РЭЦЭНЗЕНТЫ:**
*А.Л. Садоўская,* дацэнт кафедры сучаснай беларускай мовы філалагічнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, кандыдат філалагічных навук, дацэнт;

*М.А. Камарова,* дацэнт кафедры раманскіх моў установы адукацыі “Беларускі дзяржаўны эканамічны ўніверсітэт”, кандыдат філалагічных навук, дацэнт.

**РЭКАМЕНДАВАНАЯ ДА ЗАЦВЯРДЖЭННЯ:**

Кафедрай беларускай і рускай моў установы адукацыі “Беларускі дзяржаўны эканамічны ўніверсітэт”
Пратакол № 7 ад 26.01.2018 г.

Навукова-метадычным саветам установы адукацыі “Беларускі дзяржаўны эканамічны ўніверсітэт”
Пратакол № ___ ад ____________ 2018 г.

# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Беларуская мова прайшла доўгі і складаны шлях развіцця і здолела ўвасобіць у сабе найлепшыя дасягненні нацыянальнай культуры народа. Мова – духоўны пачатак нацыі, што яднае і кансалідуе людзей, звязвае мінулае з сучасным і будучыняй. Авалоданне беларускай мовай дапамагае засвоіць багаты грамадскі і культурны досвед народа, далучыцца да яго маральных і эстэтычных каштоўнасцяў, спасцігнуць псіхалогію і філасофію нацыі.

Вучэбная праграма “Трэцяя замежная мова (беларуская)” складзеная на аснове праграм: Чахоўскі Г.К. Беларуская мова як замежная: Вучэбная праграма для спецыяльнасці 1-210501 Беларуская філалогія. Мн., 2013; Даўгулевіч Н.М. Беларуская мова як замежная: Вучэбная праграма па вучэбнай дысцыпліне. Мн., 2016.

**Мэтай** вывучэння дысцыпліны з’яўляецца фарміраванне ў студэнтаў маўленчай кампетэнцыі на беларускай мове ў асноўных відах камунікатыўнай дзейнасці ў межах планаванага выкарыстання мовы.

Для рэалізацыі пастаўленай мэты ў працэсе выкладання вырашаюцца наступныя **задачы:**

**Лінгвістычныя:**

- Данесці веды пра беларускую мову як жывую, апрацаваную, унармаваную, дынамічную і адкрытую сістэму, пра яе нацыянальна-спецыфічныя рысы і законы;

**Камунікацыйныя:**

- фармаваць ўменні рэалізоўваць пэўныя тыпы і віды маўленчых інтэнцый у вербальнай форме ў адпаведнасці з нормамі беларускай мовы;
- авалодаць навыкамі выкарыстання нормаў маўленчага этыкету ў адпаведнасці з законамі і нормамі беларускай мовы;
- фарміраваць навыкі карыстання асноўнымі відам маўленчай дзейнасці: аўдыяванне (маналагічнае і дыялагічнае маўленне), пісьмо (пісьмовае ўзнаўленне ўласнага выказвання і пісьмовае прадуцыраванне чужога маўлення), гаварэнне (дыялагічнае і маналагічнае маўленне ў любой камунікацыйнай сітуацыі) і сфармаваць адпаведныя ўменні.

**Склад кампетэнцый, што фармуюцца падчас навучання:**

- *акадэмічныя кампетэнцыі;*
- *сацыяльна-асобасныя кампетэнцыі;*
- *прафесійныя кампетэнцыі.*

**Акадэмічныя кампетэнцыі**

- АК-1. Умець ужываць базавыя навукова-тэарэтычныя веды па беларускай граматыцы для вырашэння тэарэтычных і практычных задач.
- АК-2. Мець лінгвістычныя навыкі (вусная і пісьмовая камунікацыя).
- АК-3. Умець працаваць самастойна.
- АК-4. Быць здольным спараджаць новыя ідэі (крэатыўнасць).
- АК-5. Валодаць міждысцыплінарным падыходам пры вырашэнні праблем.
- АК-6. Мець навыкі, звязаныя з працай з камп'ютарам – умець ствараць электронныя прэзентацыі, умець знаходзіць інфармацыю і карыстацца ёю для павышэння кваліфікацыі на працягу ўсяго жыцця.

**Сацыяльна-асобасныя кампетэнцыі**

- САК-1. Валодаць здольнасцю да міжасобасных камунікацый.
- САК-2. Мець крытычнае мысленне.
- САК-3. Умець працаваць у камандзе.

**Прафесійныя кампетэнцыі**

- ПК-1. Валодаць навыкамі граматнага выкарыстання вуснай і пісьмовай мовы (адрозніваць на слых: фанемны склад слова, месца націску ў словах, камунікацыйны тып сказа; ажыццяўляць правільнае гукавое, рытмічнае і інтанацыйнае афармленне выказвання ў маналагічным і дыялагічным маўленні; чытаць тэкст услых, прытрымліваючыся арфаэпічных нормаў, нормаў рытмічнага афармлення словаў, словазлучэнняў, ведаць правілы сінтагматычнага чытання: злітнае вымаўленне словаў у сінтагме, правільны выбар цэнтра ІК і тыпу ІК; пісаць на слых фанетычныя і арфаграфічныя дыктанты; пісаць на слых сказы, звязны тэкст).
- ПК-2. Мець установкі на практычнае ўкараненне атрыманых ведаў у розных сферах сацыяльнай актыўнасці;
- ПК-3. Мець дакладнае ўсведамленне месца беларускай мовы ў развіцці культуры і духоўным адраджэнні нацыі;
- ПК-4. Валодаць лексічным мінімумам, неабходным для абслугоўвання паўсядзённай і сацыяльна-культурнай сферы зносін;

- ПК-5. Валодаць неабходнай сістэмай ведаў для паспяховага выкарыстання беларускай мовы у розных сферах сацыяльнай актыўнасці;
- ПК-6. Валодаць навыкамі талерантных маўленчых паводзінаў ва ўмовах дзяржаўнага білінгвізму.
- ПК-7. Валодаць формамі маўленчага этыкету.

**У выніку вывучэння дысцыпліны студэнты павінны**

**ведаць:**

- асноўныя асаблівасці фанетычнай сістэмы і артыкуляцыйнай базы беларускай мовы;
- графічную сістэму беларускай мовы;
- склад слова і асноўныя тыпы чаргаванняў гукаў;
- асноўныя граматычныя катэгорыі самастойных часцін мовы;
- асноўныя структурныя мадэлі простага і складанага сказа;
- спосабы перадачы чужой мовы, пераўтварэнне простай мовы ва ўскосную.

Вывучэнне вучэбнай дысцыпліны “Трэцяя замежная мова (беларуская)” для для спецыяльнасці 1-23 01 02 “Лінгвістычнае забеспячэнне міжкультурных камунікацый” (па напрамках) праводзіцца падчас аўдыторных заняткаў у адпаведнасці з вучэбным планам; шляхам самастойнай працы ў працэсе навучання. Вывучэнне дысцыпліны змяшчае матэрыял, што адпавядае патрабаванням навучання замежных студэнтаў лінгвістычнай спецыяльнасці для пачатковага і базавага ўзроўняў агульнага валодання і разлічанае на 100 гадзін без рэкамендаванай формы кантролю.

## ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА МАТЭРЫЯЛУ

## ТЭМА 1.
## БЕЛАРУСКАЯ МОВА Ў СІСТЭМЕ СУСВЕТНЫХ КАШТОЎНАСЦЯЎ. ЭТНАЛІНГВІСТЫЧНАЯ СІТУАЦЫЯ Ў КРАІНЕ ВЫВУЧАНАЙ МОВЫ. БІЛІНГВІЗМ

**Заняткі 1. Беларуская мова ў кантэксце сусветных моваў.**

Паняцце моўнай сям'і, групы, падгрупы. Роднасныя і няроднасныя мовы. Генетычная і тыпалагічная характарыстыка беларускай мовы.

Лексіка: Імя ўласнае. Беларускія імёны (*"Дзе Алеся, там Алесь"*).

Этыкет: Вітанні і развітанні.

**Заняткі 2. Гістарычныя этапы фарміравання і развіцця беларускай мовы.**

Перыядызацыя беларускай мовы. Праславянская мова. Стараславянская і царкоўнаславянская мовы. Старабеларуская мова і яе роля ў гісторыі беларускай культуры. Фарміраванне і развіццё новай беларускай літаратурнай мовы.

Лексіка: Імя ўласнае. Беларускія прозвішчы (на *-іч,* суфіксальныя, адпрадметныя, балцкія)

Этыкет: Падзяка і прабачэнне.

**Заняткі 3. Беларуская мова на сучасным этапе.**

Асноўныя формы існавання беларускай мовы: літаратурная і дыялектная. Жывая народная мова, арго і моладзевы слэнг.

Лексіка: Імя ўласнае. Ужыванне імёнаў па-бацьку (гісторыя і сучаснасць).

Этыкет: Пры сустрэчы. Ветлівыя звароты *спадар, спадарыня, спадарства*.

**Заняткі 4. Моўная сітуацыя ў Рэспубліцы Беларусь.**

Паняцце білінгвізму і інтэрферэнцыі. Праблема двухмоўя: ***трасянка***. Моўная палітыка. Дзяржаўнасць мовы (з 1566 г.). Беларуская мова на спажывецкім рынку (рэклама, абвесткі).

Лексіка: Дні тыдня.

## ТЭМА 2.

## УВОДНА-ФАНЕТЫЧНЫ КУРС.
## МАДЭЛІ МАЎЛЕНЧАГА ЭТЫКЕТУ

**Заняткі 1. Графіка беларускай мовы. Вымаўленне. Інтанацыя.**

Графіка: Кірыліца, лацінка і арабская вязь. Беларускі алфавіт.

Вымаўленне: Агульныя асаблівасці гукавой сістэмы беларускай мовы. Графіка і націск. Галосныя гукі *а, о, э, у, ы*. Аканне. Цвёрдыя зычныя. Зацвярдзелыя зычныя.

Лексіка: Паравіны года.

Інтанацыя: Сцвярджальныя сказы.

**Заняткі 2. Вымаўленне. Інтанацыя. Націск.**

Вымаўленне: Ётавыя галосныя *е, ё, ю, я, і*. Яканне. Націск. Мяккія зычныя. Дзеканне і цеканне. Асіміляцыя.

Лексіка: Назвы месяцаў.

Сінтаксіс: Пытальныя сказы.

Інтанацыя: Пытальныя сказы.

**Заняткі 3. Мілагучнасць беларускай мовы.**

Вымаўленне: Спалучэнні зычных. Прыстаўныя гукі (галосныя і зычныя). Падоўжаныя зычныя. Беглыя галосныя. Службовыя словы.

Граматыка: Лічэбнікі (колькасныя і парадкавыя).

Сінтаксіс: Клічныя сказы.

**Заняткі 4. З гісторыі беларускага маўленчага этыкету.**

Звароты на “вы” і на “ты”. Традыцыі беларускай гасціннасці, народныя запрашэнні да стала. Зычэнні і кленічы.

Граматыка: Цяперашні і прошлы час дзеясловаў (фармальныя прыкметы).

**Заняткі 5. Мадэлі маўленчага этыкету: віртуальная прастора.**

Ліставанне. Адрасаванні. Віртуальная лучнасць (электронны адрас: *слімачок, пісаць на адрас;* в***е***дамкі (смс), паведамленні і налепкі ў сацыяльных сетках і Вайберы, слэнгавыя скароты).

## ТЭМА 3.
## АСНОЎНЫ КУРС ПРАКТЫЧНАЙ ГРАМАТЫКІ.
## ЛЕКСІКА-ФРАЗЕАЛАГІЧНАЕ БАГАЦЦЕ МОВЫ

**Заняткі 1. Знаёмства. Чалавек і ягоны ўзрост. Сям’я (4 г.).**

Вымаўленне: Фанетычная размінка. Шпаркасловы і чыстагаворкі.

Граматыка: Род назоўнікаў. Асабовыя і прыналежныя займеннікі. І спражэнне дзеясловаў.

Сінтаксіс: Канструкцыя “Назоўнік + назоўнік”. Як задаць пытанне.

Навучальныя тэксты: Мастацкі тэкст да чытання і аўдыявання.

**Заняткі 2. Біяграфія. Мая праца. Б*у*дзень (4 г.).**

Вымаўленне: Фанетычная размінка. Шпаркасловы і чыстагаворкі.

Граматыка: Множны лік назоўнікаў. Прыметнікі. II спражэнне дзеясловаў. Рознаспрагальныя дзеясловы.

Сінтаксіс: Канструкцыя “Назоўнік + прыметнік”.

Навучальныя тэксты: Мастацкі тэкст да чытання і аўдыявання.

**Заняткі 3. Чалавек, часткі цела чалавека. Хваробы і медычная дапамога (4 г.).**

Вымаўленне: Фанетычная размінка. Шпаркасловы і чыстагаворкі.

Граматыка: Вінавальны склон назоўнікаў, займеннікаў, прыметнікаў. Трыванне дзеясловаў (фармальныя прыкметы). Навучальныя тэксты. Мастацкі тэкст для чытання і аўдыявання.

Сінтаксіс: Спалучэнні з прыназоўнікамі (вінавальны склон).

Навучальныя тэксты: Мастацкі тэкст да чытання і аўдыявання.

**Заняткі 4. Адзенне і абутак. Упрыгожанні. Крамы і мода (4 г.).**

Вымаўленне: Фанетычная размінка. Шпаркасловы і чыстагаворкі.

Граматыка: Дакладны і прыблізны час. Прыналежны займеннік *свой*. Зваротныя дзеясловы. Зваротны займеннік *сябе*.

Сінтаксіс: Кіраванне зваротных дзеясловаў (вінавальны склон).

Навучальныя тэксты: Мастацкі тэкст да чытання і аўдыявання.

**Заняткі 5. Горад. Транспарт. Арыентацыя ў горадзе (4 г.).**

Вымаўленне: Фанетычная размінка. Шпаркасловы і чыстагаворкі.

Граматыка: Месны склон назоўнікаў, займеннікаў, прыметнікаў. Будучы час дзеяслова.

Сінтаксіс: Спалучэнні з прыназоўнікамі (месны склон).

Навучальныя тэксты: Мастацкі тэкст да чытання і аўдыявання.

**Заняткі 6. Хата і побыт. Мой дом (4 г.).**

Вымаўленне: Фанетычная размінка. Шпаркасловы і чыстагаворкі.

Граматыка: Давальны склон назоўнікаў, займеннікаў, прыметнікаў. Прошлы час дзеясловаў. Трыванне дзеясловаў (семантычныя прыкметы). Даўноміналы час дзеясловаў (аналітычная форма).

Навучальныя тэксты: Мастацкі тэкст да чытання і аўдыявання.

**Заняткі 7. Партрэт. Характар. Знешнасць (4 г.).**

Вымаўленне: Фанетычная размінка. Шпаркасловы і чыстагаворкі.

Граматыка: Родны склон назоўнікаў, займеннікаў, прыметнікаў (адзіночны лік). Умоўны лад дзеясловаў.

Сінтаксіс: Абазначэнне даты (парадкавыя лічэбнікі ў родным склоне). Кіраванне зваротных дзеясловаў (родны склон). Складаназалежныя сказы ўмовы.

Навучальныя тэксты: Мастацкі тэкст да чытання і аўдыявання.

**Заняткі 8. Нацыянальная кухня. Госці. Харчовая крама і рэстарацыя (4 г.).**

Вымаўленне: Фанетычная размінка. Шпаркасловы і чыстагаворкі.

Граматыка: Родны склон назоўнікаў, займеннікаў, прыметнікаў (множны лік). Няпэўна-колькасныя словы.

Сінтаксіс: Спалучальнасць няпэўна-колькасных словаў. Спалучальнасць назоўнікаў з няпэўна-колькаснымі лічэбнікамі. Адмоўныя канструкцыі. Складаназалежныя сказы часу.

Навучальныя тэксты: Мастацкі тэкст да чытання і аўдыявання.

**Заняткі 9. Вольны час. Улюбёны занятак, спорт і адпачынак (4 г.).**

Вымаўленне: Фанетычная размінка. Шпаркасловы і чыстагаворкі.

Граматыка: Творны склон назоўнікаў, займеннікаў, прыметнікаў. Пытальныя займеннікі.

Сінтаксіс: Кіраванне зваротных дзеясловаў (творны склон). Складаназалежныя сказы прычыны.

Навучальныя тэксты: Мастацкі тэкст да чытання і аўдыявання.

**Заняткі 10. Вандроўкі. Пошта і вакзал. Памятныя мясціны (4 г.).**

Вымаўленне: Фанетычная размінка. Шпаркасловы і чыстагаворкі.

Граматыка: Узаемны займеннік. Адмоўныя займеннікі. Адмоўныя прыслоўі.

Сінтаксіс: Кіраванне дзеясловаў. Адмоўныя безасабовыя сказы.

Навучальныя тэксты: Мастацкі тэкст да чытання і аўдыявання.

**Заняткі 11. Музыка і музычныя інструменты. Знакамітасці (4 г.).**

Вымаўленне: Фанетычная размінка. Шпаркасловы і чыстагаворкі.

Граматыка: Загадны лад дзеясловаў.

Сінтаксіс: Складаназалежныя сказы мэты.

Навучальныя тэксты: Мастацкі тэкст да чытання і аўдыявання.

**Заняткі 12. Архітэктура. Жывапіс. Кіно. Славутасці (4 г.).**

Вымаўленне: Фанетычная размінка. Шпаркасловы і чыстагаворкі.

Граматыка: Ступені параўнання прыслоўяў. Дзеясловы руху (беспрыставачныя).

Сінтаксіс: Параўнальная канструкцыя з кампаратывам прыслоўя. Складаназлучаныя сказы (размеркавальныя).

Навучальныя тэксты: Мастацкі тэкст да чытання і аўдыявання.

**Заняткі 13. Аўтэнтычныя беларускія святы. Як павіншаваць (4 г.)?**

Вымаўленне: Фанетычная размінка. Шпаркасловы і чыстагаворкі.

Граматыка: Ступені параўнання прыметнікаў. Дзеясловы руху (прыставачныя).

Сінтаксіс: Параўнальная канструкцыя з кампаратывам прыметніка. Складаназлучаныя сказы (супраціўныя).

Навучальныя тэксты: Мастацкі тэкст да чытання і аўдыявання.

**Заняткі 14. Сродкі масавай інфармацыі (4 г.).**

Вымаўленне: Фанетычная размінка. Шпаркасловы і чыстагаворкі.

Граматыка: Азначальныя займеннікі. Указальныя займеннікі. Дзеясловы *садзіцца / сесці / сядзець* і падобныя.

Сінтаксіс: Канструкцыя “Адзін з + словазлучэнне ў родным склоне множнага ліку”. Складаназлучаныя сказы (спалучальныя).

Навучальныя тэксты: Мастацкі тэкст да чытання і аўдыявання.

**Заняткі 15. Дзяржава. Грамадства. Рэлігія (4 г.).**

Вымаўленне: Фанетычная размінка. Шпаркасловы і чыстагаворкі.

Граматыка: Прыналежныя прыметнікі. Дзеепрыметнікі.

Сінтаксіс: Складаназалежныя сказы (азначальныя).

Навучальныя тэксты: Мастацкі тэкст да чытання і аўдыявання.

**Заняткі 16. Флора і фаўна (4 г.).**

Вымаўленне: Фанетычная размінка. Шпаркасловы і чыстагаворкі.

Граматыка: Дзеепрыслоўе.

Сінтаксіс: Выкарыстанне дзеепрыслоўных зваротаў. Кіраванне. Безасабовыя сказы (стан чалавека). Параўнальныя звароты.

Навучальныя тэксты: Мастацкі тэкст да чытання і аўдыявання.

**Заняткі 17. Паляванне. Рыбарства (4 г.).**

Вымаўленне: Фанетычная размінка. Шпаркасловы і чыстагаворкі.

Граматыка: Зборныя лічэбнікі. Напэўныя займеннікі. Няпэўныя прыслоўі.

Сінтаксіс: Безасабовыя сказы (мадальныя). Складаназалежныя сказы саступкі.

Навучальныя тэксты: Мастацкі тэкст да чытання і аўдыявання.

**Заняткі 18. Прырода. З’явы прыроды. Каляндар (4 г.).**

Вымаўленне: Фанетычная размінка. Шпаркасловы і чыстагаворкі.

Граматыка: Безасабовыя дзеясловы. Лічэбнікі *паўтара, паўтары*. Рознаскланяльныя назоўнікі ніякага роду.

Сінтаксіс: Безасабовыя сказы (прыродныя з’явы). Безасабовыя сказы (стан навакольнага асяроддзя).

Навучальныя тэксты: Мастацкі тэкст да чытання і аўдыявання.

# ТЭМА 4.
# СТЫЛІСТЫКА І КУЛЬТУРА МАЎЛЕННЯ.
# ЛЕКСІКА-ФРАЗЕАЛАГІЧНАЕ БАГАЦЦЕ МОВЫ

**Заняткі 1. Нацыянальная адметнасць беларускай лексікі.**
Панятак безэквівалентнасці. Закон эканоміі моўных сродкаў у лексіцы і дэталізаваныя сінонімы. Беларускія экзатызмы і метафарычныя пераасэнсаванні. Лексічная інтэрферэнцыя.

**Заняткі 2. Нацыянальная адметнасць беларускай фразеалогіі.**
Метафарычнасць, рытміка і экспрэсія жывой народнай фразеалогіі. Функцыянальнасць яе выкарыстання ў размове па-беларуску. Фразеалагічная інтэрферэнцыя.

**Заняткі 3. Паняцце сінтаксічнай ідыяматыкі.**
Унутрымоўная спецыфіка нацыянальнай сінтаксічнай ідыяматыкі. Асаблівасці беларускага дапасавання, кіравання і прымыкання. Міжмоўныя адрозненні. Сінтаксічная інтэрферэнцыя.

**Заняткі 4. Функцыянальныя стылі мовы.**
Моўныя нормы і камунікацыйныя якасці маўлення: правільнасць, дакладнасць, лагічнасць, чысціня, дарэчнасць, багацце, выразнасць.

**Заняткі 5. Стылістыка перакладу.**
Стылістыка перакладу як найвышэйшы ўзровень валодання мовай. Асноўныя асаблівасці перакладу з рускай мовы на беларускую (агульны і прафесійны тэкст).

# ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНАЯ КАРТА ДЫСЦЫПЛІНЫ

| Нумар тэмы | Назва тэмы | Колькасць аўдыторных гадзін | | | | | Іншае | Форма кантролю ведаў |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | Лекцыі | Практычныя заняткі | Семінарскія заняткі | Лабараторныя заняткі | Колькасць гадзін | | |
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 |
| 1 | Беларуская мова ў сістэме сусветных каштоўнасцяў. Этналінгвістычная сітуацыя ў краіне вывучанай мовы. Білінгвізм | | 8 | | | | [1, 2, 3, 4, 5] | Вуснае апытанне. Прэзентацыі. Бягучы кантроль: тэст. |
| 2 | Уводна-фанетычны курс. Мадэлі маўленчага этыкету | | 10 | | | | [1, 2, 3, 4, 5] | Вуснае апытанне. Прэзентацыі. Бягучы кантроль: тэст. |
| 3 | Асноўны курс практычнай граматыкі. Лексіка-фразеалагічнае багацце мовы | | 72 | | | | [1, 2, 3, 4, 5] | Вуснае апытанне. Прэзентацыі. Бягучы кантроль: тэст. |
| 4 | Стылістыка і культура маўлення. Лексіка-фразеалагічнае багацце мовы | | 10 | | | | [1, 2, 3, 4, 5] | Вуснае апытанне. Прэзентацыі. Бягучы кантроль: тэст. |
| | **РАЗАМ**: | | **100** | | | | | **Кантрольны тэст** |

# ІНФАРМАЦЫЙНА-МЕТАДЫЧНАЯ ЧАСТКА

## Метадычныя рэкамендацыі па арганізацыі самастойнай працы студэнтаў па вучэбнай дысцыпліне “Трэцяя замежная мова (беларуская)”

У авалоданні ведамі вучэбнай дысцыпліны важным этапам з’яўляецца самастойная праца студэнтаў. Рэкамендуецца бюджэт часу для самастойнай працы ў сярэднім 1-1,5 гадзіны на 2-х гадзінныя аўдыторныя заняткі.

Асноўнымі напрамкамі самастойнай працы студэнта з’яўляюцца:

- ✓ азнаямленне з праграмай вучэбнай дысцыпліны;
- ✓ азнаямленне са спісам рэкамендаванай літаратуры па вучэбнай дысцыпліне ў цэлым і яе раздзелах, вывучэнне неабходнай літаратуры па тэме, падбор дадатковай літаратуры;
- ✓ вывучэнне лекцыйнага матэрыялу выкладчыка і яго пашырэнне за кошт азнаямлення з рэкамендаванай літаратурай і матэрыяламі;
- ✓ падрыхтоўка да семінарскіх заняткаў паводле адмыслова распрацаваных планаў з вывучэннем рэкамендаванай літаратуры;
- ✓ падрыхтоўка да выканання дыягнастычных формаў кантролю (тэсты, калёквіум, кантрольныя работы і да т. п.);
- ✓ падрыхтоўка да кантрольнага тэсту.

## Асноўная літаратура


1. Белорусский язык для стран СНГ: учебник / Н.Ю. Павловская, О.В. Борисенко, П.В. Васюченко, Л.С. Кныш, О.В. Семенькевич, Г.К. Чеховский. – М., 2012. – 452 с. + 1 электрон. апт. дыск.
2. Мыцык, Г.В. По-белорусски? Пожалуйста = Па-беларуску? Калі ласка / Г.В. Мыцык. – Мінск, 2015. – 296 с.
3. Рамза, Т.Р. Беларуская мова? З задавальненнем! Для замежных навучэнцаў / Т.Р. Рамза. – Мінск, 2010. – 310 с. + 1 электрон. апт. дыск: гук.
4. Сомин, А.А. Белорусский язык. Самоучитель. – М., 2017. – 224 с.
5. Старавойтава, Н.П. Беларуская мова: гісторыя і сучаснасць. – Мінск, 2006. – 182 с.


## Дадатковая літаратура


6. Аляксандраў, С.Э., Мыцык, Г.В. Гавары са мной па-беларуску: Гутарковая мова ў штодзённым ужытку / С. Аляксандраў, Г. Мыцык. – М., 2008. – 280 с.
7. Гаворым па-беларуску: вучэб. дапам. па беларускай мове для замежных навучэнцаў / пад. рэд. Л.І. Сямешкі. – Мінск, 1999.– 247 с.
8. Гуртыг, К. Кароткая граматыка беларускай мовы ў табліцах для нямецкамоўных навучэнцаў / К. Гуртыг. – Мінск, 2001. – 89 с. (на нямецкай мове)
9. Літвіноўская, А. Мова Нанова: 20 крокаў да беларускай мовы / А. Літвіноўская, Г. Лабадзенка. – Мінск, 2016. – 168 с. + 24 іл.
10. Клябанаў, Д.Ф. Крок да кроку. Знаёмімся з Беларуссю. Мова. Культура. Краязнаўства. – Кракаў, 2010. – 198 с. (на польскай мове)
11. Культура і гісторыя беларусаў: Тэксты і заданні: вучэб. дапам. па практыцы беларускага маўлення для замежных студэнтаў / аўт.-склад. С.А. Важнік, І.І. Савіцкая. – Мінск, 2003. – 80 с.
12. Лексічны мінімум па беларускай мове як замежнай. Элементарны ўзровень (А1). Агульнае валоданне / склад.: Л.І. Сямешка [і інш.]. – Мінск, 2016. – 76 с.
13. Рамза, Т.Р. Беларуская мова за 20 заняткаў: інтэнсіў-курс (пробная версія) / Т.Р. Рамза, С. Тэш. – Oldenburg, 2009.– 124 с.
14. Рамза, Т.Р., Кіёсава, С., Усуяма, Т. Спрабуйма! Азнаямляльна-пачатковы курс беларускай мовы для японцаў. – Цукуба, 2016. – 72 с. (на японскай мове)
15. Станкевіч, Л., Каткіч, Ж. Дваццаць сустрэч з Беларуссю: падручнік па беларускай мове для пачаткоўцаў / пад агул. рэд. А. Золтана. – Budapest, 2006. – 265 р. (на венгерскай мове)
16. Stankevich, G. Conversational Belarusian for English-speaking students. – Prague, 2001. – 52 p. (на англійскай мове)

17. Тэсты па беларускай мове як замежнай. Элементарны ўзровень (А1). Агульнае валоданне / склад.: Л.І. Сямешка [і інш.]. – Мінск, 2017. – 112 с.

ПРАТАКОЛ УЗГАДНЕННЯ ВУЧЭБНАЙ ПРАГРАМЫ УВА

| **Назва вучэбнай дысцыпліны, якой патрабуецца ўзгадненне** | **Назва кафедры** | **Прапановы аб зменах у змест вучэбнай праграмы ўстановы вышэйшай адукацыі па вучэбнай дысцыпліне** | **Рашэнне, прынятае кафедрай, якая распрацавала праграму (з указаннем даты і нумара пратакола)** |
|---|---|---|---|
| | | | |